цыённага камітэта Могилёвской губернии», у ліст.— снеж. 1918 «Известия Могилёвского губернского революционного комитета», у 1919—25 «Соха и молот», да 1929 «Магілёўскі селянін», да 1941 «Камунар Магілёўшчыны». У Вял. Айч. вайну [орган Магілёўскага падп. абкома КП(б)Б], у 1945—56 наз. «За Радзіму», з 12.8.1956 «М. п.». У 1924 мела літ. дадатак «Зарницы». Асвятляе пытанні грамадска-паліт., эканам. і культ. жыцця вобласці. Друкуе літ. старонку «Прыдняпроўе», матэрыялы па л-ры і мастацтву над рубрыкамі «Па кніжную паліцу», «Кнігі нашых землякоў», «Культура і час», «Навіны культуры», «Тэатр», «Кіно», «У свеце муз». У газеце друкаваліся пісьменнікі К. Губарэвіч, В. Гарбацэвіч, Я. Шарахоўскі, П. Прыходзька, П. Кавалёў, С. Гаўрусёў, І. Гутараў, М. Герасімаў, І. Шклярэўскі, В. Ракаў, А. Сербантовіч, працавалі Ю. Лявонны, Э. Валасевіч, В. Матэвушаў, А. Пысін, М. Ткачоў, В. Карамазаў, М. Гарулёў, Г. Шчарбатаў, І. Апошкін, працуе А. Кандрусевіч. Пры рэдакцыі працуе літ. аб'яднанне. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга (1968). *М. М. Гарадзецкі.*

**МАГІЛЁЎСКАЯ РАЗЬБА**, арх. дэкор, пашыраны ў Магілёве ў 19 — 1-й пал. 20 ст.; адносіцца да лепных узораў *разьбы архітэктурнай*. Традыцыі склаліся ў 17—18 ст. у жыллі пад уплывам стылю барока. Разьба ўвыглядзе геам. і раслiннага арнаменту (краявая, скразная і прапілавачная) паярусна размяшчаецца на фасадах драўляных дамоў.





Да арт. **Магілёўская разьба.** Фрагмент франтона жылога дома на вуліцы Яцыны, 13 (уверсе) і франтон жылога дома на вуліцы Яцыны, 19.



Да арт. **Магілёўская разьба.** Падзор жылога дома на вуліцы Пляханава, 27.

Найб. багата аздабляліся франтоны, дзе разьба ўтварала некалькі па-рознаму выращаных радоў, прамежкі паміж якімі запаўняліся шалёўкай (вертыкальнай з пашчыльнікамі, гарызантальнай, косай; вул. Яцыны, 13, Чэлюскінцаў, 56, і інш.). Дэкаратыўнымі акцэнтамі з'яўляюцца аздобленыя разнымі ліштвамі адзінарныя ці падвойныя вокны (прамавугольныя, стральчатыя) на франтонах, шчыты ўваходных парталаў, падаконныя і надаконныя пояскі, падзоры (вул. Яцыны, 19, Лазарэнкі, 31, Пляханава, 27). Разьба ўзбагачае пластыку фасадаў вытанчанай святлоценявой мадэліроўкай, узмацняе іх рытмічную пабудову, кантрастна вылучае найб. значныя элементы, падкрэслівае тэктоніку збудаванняў. У некаторых будынках разныя элементы на фоне сцен вылучаюцца светлым колерам. *Ю. А. Якімовіч.*

**МАГІЛЁЎСКАЯ РАТУША.** Існавала ў канцы 17—20 ст. Пабудавана ў 1679—81 у Магілёве на б. Гандлёвай пл. (сучасная пл. Савецкая) мясц. дойлідам Феськам. У 1682 каля 2-павярховага прамавугольнага ў плане (28×10,5 м) кампактнага будынка, дзе размяшчаліся памяшканні канцылярыі, суд, зала пасяджэнняў магістрата, архіў, а ў падвале была казна, скарбніца, склады, турма, пачата буд-ва 1-й вежы (майстар Крузберг з Быхава; пры



Магілёўская ратуша.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

буд-ве ў 1686 разбурылася). У 1692—98 пастаўлена 2-я вежа (дойлід Ігнат; выш. каля 38 м; закончана ў 1733), якая стала гал. дамінантай горада. 8-гранная шмат'ярусная вежа крыху звужалася ўгару і завяршалася гранёным купалам са шпілем. Ярусы былі аздоблены рустам, вокнамі і нішамі разнастайных форм, балконам з металічнымі кратамі, вял. гарадскім гадзіннікам. Гал. і дваровы ўваходы вылучаліся ганкамі. Франтон, шпіль вежы, дах ганкаў упрыгожвалі пазалочаныя флюгеры.

У 17 ст. памяшканні 1-га і 2-га паверхаў ацяпляліся печамі, аздобленымі тэракотавай і зялёнай кафляй; лесвіцы ўпрыгожаны разнымі драўлянымі балясамі. У 1773 корпус ратушы перабудаваны. Гарызантальны пояс падзяляў сцяну будынка на 2 ярусы: 1-ы руставаны, вокны 2-га мелі абрамленні. Архітэктура фасадаў стала адпавядаць архітэктуры дамоў губернатара і віцэ-губернатара, узведзеных у стылі класіцызму. Да будынка прылягаў гасціны двор. Будынак М. р. не збярогся. Іл. гл. таксама ў арт. *Магілёў*. *А. А. Трусаў.*

**МАГІЛЁЎСКАЯ СПА́СКАЯ ЦАРКВА́.** Існавала ў 18—1-й пал. 20 ст. Пабудавана ў стылі позняга барока ў цэнтр. частцы Магілёва як гал. храм праваслаўнага Спаскага манастыра. Закладзена ў 1740; у 1748 знішчана пажарам, у 1756—62 адбудавана (арх. І. К. Глаўбіц). Аднанефавы крыжова-купальны мураваны



Магілёўская Спаская царква. Малюнак.

храм з 2-вежавым гал. фасадам. Неф і невял. трансепт былі завершаны развітым антаблементам і накрыты ўзаемна перпендыкулярнымі 2-схільнымі дахамі. На сяродкрыжжы размяшчаўся купал з галоўкай на высокім светлавым барабане, абкружаны 4 дэкар. галоўкамі на высокіх шыйках.

Сцены былі дэкарыраваны падвойнымі пілястрамі і ляпнымі абрамленнямі лучковых праёмаў. Гал. фасад завяршаўся 2-яруснымі чацверыковымі вежамі з галоўкамі і фігурным франтонам паміж імі. 2-светлавы інтэр'ер быў багата аздоблены творамі мясц. майстроў М. Пігарэвіча і П. Слізыка. Царква не збераглася. *Т. І. Чарняўская.*



Магілёўская сядзіба «Піпенберг». Галоўны фасад сядзібнага дома. Чарцёж.

**МАГІЛЁЎСКАЯ СЯДЗІ́БА «ПІ́ПЕНБЕРГ».** Існавала ў канцы 18—19 ст. на ўскраіне Магілёва. Ансамбль сядзібы размяшчаўся на 2 тэрасах на правым беразе Дняпра. На верхняй тэрасе быў прамавугольны штучны вадаём, стаяў сядзібны дом у стылі класіцызму з элементамі несапраўднай готыкі, на ніжняй — натуральныя і штучныя пасадкі, творы архітэктуры малых форм.

Цэнтр ансамбля — 3-павярховы мураваны прамавугольны ў плане сядзібны дом (1780-я г.) з сіметрычнай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй. Цэнтр гал. фасада, арыентаванага на раку, быў вылучаны плоскім рызалітам, 8-калонным порцікам з балконам і завяршаўся паўфрантонам. Вокны 1-га паверха прамавугольныя, 2-га і 3-га — стральчатыя. Планіроўка мяшаная, у цэнтры размяшчалася прамавугольная ў плане парадная зала з выхадам на балкон. Вестыбюль, лесвіцы і інш. дапаможныя памяшканні згрупаваны ў частцы дваровага фасада. Сядзіба не збераглася. Асталіся рэшткі фундаментаў, часткова збярогся парк.

*В. Ф. Марозаў.*

**МАГІЛЁЎСКАЯ УСПЕ́НСКАЯ ЦАРКВА́.** Існавала ў 17—20 ст. Пабудавана ў 1670 на паўд.-ўсх. ускраіне Магілёва непадалёку ад Дняпра ў комплексе з невял. «цёплай» царквой і званіцай. Мураваны 3-апсідны крыжова-купальны храм (у плане лацінскі крыж). Асн. аб'ёмы былі накрыты ўзаемна перпендыкулярнымі 2-схільнымі дахамі з трохвугольнымі франтонамі на тарцах. На сяродкрыжжы на масіўным шматгранным барабане купал з галоўкай. Невял. паўкруглыя апсіды, бакавыя ўваходныя тамбуры, якія прылягалі да крылаў трансепта, і гранёны тамбур гал. ўвахода дапаўнялі кампазіцыю і падкрэслівалі яе крыжова-цэнтрычны характар. Сцены былі расчлянёны пілястрамі і прарэзаны паўцыркульнымі вокнамі ў плоскіх арачных нішах. Асн. неф быў перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі, крылы трансепта — крыжовымі скляпеннямі. Не збераглася.

*Літ.:* Чарняўская Т. І. Архітэктура Магілёва: З гісторыі планіроўкі і забудовы горада.— Мн., 1973, с. 29—30.

**МАГІЛЁЎСКАЯ ФА́БРЫКА МАСТА́ЦКІХ ВЫРАБАЎ** імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Створана ў 1960 на базе вышывальнай арцелі імя Н. К. Крупскай, імя 60-годдзя Вял. Кастрычніка прысвоена ў 1977. Асн. прадукцыя: строчана-вышытыя, трыкат. вырабы (жаночыя сукенкі, блузы, касцюмы, спадніцы і інш.) з традыц. бел. арнаментам, сувеніры з саломы і дрэва. Створаны ўчас-